# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ – АДЗІН З НАПРАМКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕЙСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

**В. А. Коласава,** *старшы навуковы супрацоўнік ДУ «Вілейскі краязнаўчы музей»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патрыятызм – маральны і палітычны прынцып, зместам якога з’яўляецца любоў да ўсяго айчыннага, пачынаючы ад мясцовасці, дзе чалавек нарадзіўся, яго народа, мовы, культуры, і да дзяржавы, грамадзянінам якой ён з’яўляецца. Выразны патрыятычны характар маюць прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны да яго перакладаў Бібліі. У адной з кніг ён пісаў: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знаютъ ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведаютъ гнезда своя; рибы, плавающие по морю и в реках, чуютъ виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих. Тако ж и люди, и где зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають (з прадмовы да кнігі «Иудиф – Вдовици», пачатак XVI ст.).

Сапраўды, кожны чалавек павінен ведаць не толькі назву месца, дзе ён нарадзіўся і пражывае, але і гісторыю свайго краю, знакамітых землякоў – ведаць і ганарыцца імі. І ў гэтым вялікую ролю адыгрываюць краязнаўчыя музеі. Менавіта краязнаўчыя музеі павінны стаць цэнтрамі патрыятычнага выхавання і фарміравання ў падрастаючага пакалення і моладзі пачуцця грамадзяніна – патрыёта, для якіх радзіма, бацькаўшчына і родны край павінны стаць найвялікшымі святынямі.

У Вілейскім краязнаўчым музеі прапаганда нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны вядзецца ў розных кірунках. Гэта перш за ўсё экспазіцыйна-выставачная дзейнасць. Экскурсіі ў музей ужо даўно сталі не проста знаёмствам з экспазіцыяй, але і ўрокам роднай мовы, каб кожны наведвальнік пакідаў музей з пачуццём гонару і павагі да свайго краю.

У сувязі з тым, што колькасць дарослых наведвальнікаў у апошнія гады змяншаецца, набывае актуальнасць праца з дзецьмі дашкольных устаноў і школьнай моладзі горада і раёна. Таму добрай традыцыяй у музеі стала правядзенне для вучняў пачатковых класаў у пачатку новага навучальнага года экскурсіі «Добры дзень, музей!» Першакласнікі не толькі знаёмяцца з экспазіцыяй музея, пазнаюць гісторыю роднага краю, але і

даведваюцца, што ўяўляе сабой музей у жыцці грамадства. З першай сустрэчы вучні асэнсоўваюць, што музей захоўвае не толькі музейныя прадметы, але і беларускую мову, культуру, абрады і традыцыі нашых продкаў.

Зараз вучні 4-х класаў вывучаюць новы прадмет «Мая Радзіма – Беларусь», дзякуючы гэтаму яны разам з настаўнікам даведваюцца аб мінулым і сённяшнім не толькі сваёй краіны, але і сваёй мясцовасці. І тут на дапамогу зноў прыходзіць музей. Намі распрацаваны цыкл урокаў-экскурсій па раздзелах падручніка. Мы пераканаліся, што галоўнае ў такім узросце – нагляднасць. Вынікі ад гэтых заняткаў самыя станоўчыя.

У 2010 г. распачаты новы праект – праграма «Гістарычныя вандроўнічкі, або У госці да Алены» – цыкл заняткаў-гульняў, заняткаў-лекцый для выхаванцаў дзіцячых садкоў і вучняў школ. Аўтар праекта – галоўны захавальнік фондаў музея Алена Валянцінаўна Стрэж.

Задачы, пастаўленыя ў дадзеным праекце, наступныя:

– пашыраць веды пра родны край, помнікі гісторыі і культуры;

– паглыбляць пачуццё любові і прыхільнасці да сваёй зямлі;

– фарміраваць інтарэс да мінулага і сучаснага, да духоўных каштоўнасцей свайго народа;

– далучаць дзяцей да ўсіх відаў нацыянальнага мастацтва: ад архітэктуры да жывапісу і арнаменту; ад танца, казкі, музыкі да тэатра;

– выхоўваць культуру талерантнасці (павагу да годнасці ўсіх без выключэння людзей, цярпімасці ў адносінах да іншых);

– узбагачаць маўленне дзяцей творамі беларускага фальклору.

Сярод шматлікіх сродкаў для вырашэння пастаўленых задач найбольш дзейснымі з’яўляюцца:

– родная мова. Менавіта з пазнання роднай мовы, з усведамлення яе найвялікшай каштоўнасці і святыні свайго народа пачынаецца станаўленне самасвядомасці дзяцей. Родная мова – гэта не проста сукупнасць знакаў, а магутны сродак, з дапамогай якога дзеці далучаюцца да сваіх продкаў і нашчадкаў, гэта тое, што робіць іх прыхільнымі да бясконцага шэрагу пакаленняў, якія жылі да іх і будуць жыць пасля іх;

– традыцыі, звычаі, абрады, святы – гэта найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры;

– фальклор ва ўсіх яго праяўленнях (казкі, загадкі, пацешкі, лічылкі і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сродкі матэрыяльнай культуры: элементы побыту беларускага народа (печ, стол, лаўка, посуд і інш.), прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (тканыя ручнікі, посцілкі, абрусы; выцінанка і інш.); нацыянальнае народнае адзенне (кашуля, спадніца, безрукаўка, фартух і інш.), абрадавыя лялькі, нацыянальная мастацкая літаратура і інш.

Дадзены праект падзелены на тры цыклы. Кожны цыкл з’яўляецца падрыхтоўкай для вывучэння наступных тэм. Распрацаваныя тэмы размеркаваны такім чынам, што знаёмства ідзе ад простых, усім вядомых рэчаў да больш складаных.

Кожны занятак суправаждаецца ілюстрацыйным матэрыялам, які выканаў архітэктар, краязнаўца і мастак музея Анатоль Іванавіч Капцюг. Ён стварыў серыю малюнкаў, якія даюць магчымасць уявіць, як, напрыклад, выглядала сялянская сядзіба з усімі гаспадарчымі пабудовамі, якое было ўбранне хаты, як жылі і якімі промысламі і рамёствамі займаліся сяляне, як адзначалі гадавыя святы і інш.

На малюнках, насычаных красамоўнымі гумарыстычнымі дэталямі, раскрываецца цэлая гісторыя адной сям’і, адной вёскі пачатку XX ст. Многае заснавана на ўспамінах Анатоля Капцюга з яго дзяцінства, калі ён жыў у бабулі на хутары паміж вёскамі Бараўцы і Урэчча на Вілейшчыне, і тых аповедаў, якія памятаў ад свайго дзеда Грышкі. Усе малюнкі можна было пабачыць на старонках «Рэгіянальнай газеты», дзе на працягу двух гадоў пад рубрыкай «Куфэрак» выходзіла «Школка дзядзькі Капцюга».

Звычайна заняткі праходзяць у невялікім пакойчыку выставачнай залы музея, які нагадвае інтэр’ер беларускай сялянскай хаты.

Праект спадабаўся як дарослым, так і дзецям, і набыў вялікую папулярнасць сярод вілейчан.

У пачатку 2012 г. распачаты яшчэ адзін праект «Ці ведаеш свой край», разлічаны ў асноўным на вучняў сельскіх школ.

Мэта праекта: даследаванне, вывучэнне, знаёмства і прапаганда гісторыі і культуры сваёй мясцовасці – вёскі, дзе ты зараз жывеш, дзе ўпершыню пераступіў школьны парог, дзе зрабіў першы крок у дарослае жыццё. Менавіта тут, ля парога бацькоўскага дома, і пачынаецца твая радзіма. Тут ты нарадзіўся, тут жылі твае продкі, жывуць і працуюць твае бацькі, сваякі, суседзі – землякі, грамадзяне нашай краіны.

Праект складаецца з трох частак:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Прэзентацыя. Праз унікальныя фотаздымкі з фондаў музея (некаторыя прадстаўлены ўпершыню) паказаць і расказаць гісторыю пэўнай мяцовасці – вёскі: падзеі, якія тут адбываліся і многія з іх маюць далёка не мясцовае значэнне; знакамітых людзей, якія тут нарадзіліся, жылі і сёння жывуць побач з намі або лёсам звязаны з гэтым краем.

2. «Пачатак кніжнасці» да «Года кнігі» – кніжныя рарытэты, якія захоўвае музей, ад старадрукаў да кніг Ігнація Ходзькі, пісьменніка – класіка польскай літаратуры XIX ст., які нарадзіўся і жыў на Вілейшчыне і многія свае творы прысвяціў апісанню гісторыі, побыту жыхароў вілейскага краю, да літаратуры сучаснай – з аўтографамі вядомых пісьменнікаў.

3. «Вілейка: горад па-над Віліяй» – паказ фільма, які стаў пераможцам Першага рэспубліканскага свята-конкурса аматарскага краязнаўчага кіно «Гэта мой край» у намінацыі «За лепшае рэжысёрскае рашэнне», у кастрычніку 2010 г. Стварэнне відэафільма па гісторыі вілейскага краю і правядзенне Першага рэспубліканскага кінафестывалю адбываліся ў рамках міжнароднага праекта «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» пры фінансавай падтрымцы Праграмы развіцця Арганізацыі Аб’яднаных Нацый і Еўрапейскага Саюза. Фільм стаў наглядным дапаможнікам для ўсіх школ горада і раёна, прэзентуецца турыстычным групам, які наведваюць музей, а таксама на прыёмах афіцыйных дэлегацый.

«Краязнаўства – гэта самы масавы від навукі: у зборы матэрыялаў могуць прыняць удзел і вялікія вучоныя, і школьнікі». Гэтыя словы знакамітага вучонага, даследчыка і пісьменніка Д.С. Ліхачова сталі ідэяй стварэння ў 2009 г. аматарскага аб’яднання «Спадчына» Вілейскага цэнтра эстэтычнага выхавання і краязнаўчага музея (кіраўнікі Марына Мікалаеўна Жыльцова і Вольга Аляксандраўна Коласава).

Мэты дзейнасці аб’яднання:

– авалоданне вучнямі гістарычнымі ведамі аб найважнейшых падзеях, з’явах, працэсах, традыцыях і заканамернасцях сусветнай гісторыі, гісторыі Беларусі і канкрэтна Вілейшчыны ў іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці;

– інтэлектуальнае выхаванне, развіццё творчасці;

– далучэнне вучняў да дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміраванне каштоўнасных арыентацый на аснове ідэй гуманізму і патрыятызму.

Напрамкі дзейнасці: краязнаўчы; навукова-даследчы; культурна-асветніцкі; прафарыентацыйны; музейны.

Формы заняткаў: групавыя; індывідуальныя; камандныя; экскурсійныя.

Праграма разлічана на дзяцей і падлеткаў 15–18 гадоў. Курс распрацаваны на два гады.

За гэты час навучэнцы аб'яднання прынялі ўдзел у шматлікіх конкурсах і навукова-практычных канферэнцыях: рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных:

– 2010 г. – рэспубліканская канферэнцыя студэнтаў і школьнікаў «Беларуская філалогія і культура на сучасным этапе: праблемы, тэндэнцыі, перспектывы» (БДПУ імя Максіма Танка, г. Мінск);

– 2011 г. – конкурс «Праваслаўныя святыні беларускага народа» (Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, г. Мінск);

– 2011–2012 гг. – Міжнародны маладзёжны форум студэнцкай і вучнёўскай моладзі «Першы шаг у навуку» (НАН РБ);

– 2012 г. – рэспубліканская летняя адукацыйная школа для моладзі «Асновы арганізацыі і правядзення навуковых даследаванняў (НАН РБ).

Навучэнец аб'яднання «Спадчына», вучань 10 класа сярэдняй школы № 3 Вілейкі Дзмітрый Мандрык атрымаў дыплом 2-й ступені за лепшы секцыйны даклад «Віртуальны музей Вілейскага раёна» на Міжнароднай маладзёжнай навукова-практычнай канферэнцыі «Научные стремления», якая адбывалася ў лістападзе 2012 г. у Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Каб быць патрыётам, трэба ведаць сваю гісторыю і ганарыцца ёю, трэба памятаць, як змагаліся абаронцы Брэсцкай цытадэлі, Масквы, Сталінграда, падпольшчыкі і партызаны – увесь беларускі народ ва ўсіх войнах, якія пакідалі трагічны след на нашай зямлі, помніць усіх тых, хто змагаўся і выжыў, хто стаяў насмерць дзеля жыцця і міру на зямлі.

Патрыятызм, маральны дух быў і застаецца сёння важнейшым фактарам дасягнення перамогі.

Наша краіна – маладая, дэмакратычная, прававая дзяржава, якой вельмі патрэбна, каб маладыя людзі станавіліся сапраўднымі грамадзянамі, патрыётамі Рэспублікі Беларусь. Быць патрыётам і паўнапраўным грамадзянінам – значыць, у першую чаргу, быць гаспадаром, стваральнікам у родным доме, на роднай зямлі, творча

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працаваць на карысць Радзімы. Быць патрыётам – значыць берагчы і захоўваць маральныя каштоўнасці свайго народа, яго духоўнае багацце, быць верным ідэалам сваіх бацькоў і дзядоў, ведаць і любіць гісторыю і культуру сваёй краіны.

1. *Беларусь* – страна твоего будущего. Книга для выпускника / авт.-сост. Н.Г. Ванина, Н.Н. Ганущенко, В.И. Ивченков. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Пачатковая школа, 2010. – 168 с. : ил. + СД.

2. *Музееведение.* Музеи исторического профиля : учеб. пособие для вузов по спец. «история» / под ред. К.Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

3. *Музейная* камунікацыя як сродак прапаганды гісторыка-нацыянальнай спадчыны : тэзісы паведамленняў і дакладаў навук.-практ. краязнаўчай канф. Мінскай вобл. – Мінск : [Б.в.], 1995. – 16 с.

4. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі : у 6 т. Т.5. М – Пуд / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (галоўны рэд. ) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – 592 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ